Настаўніцкая газета
15 верасня 2016 года

# Адукацыя і культура ўзаемадзейнічаюць



**Дагавор аб супрацоўніцтве падпісалі Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі і Гродзенская дзіцячая школа мастацтваў імя А.Тызенгаўза.**

— Функцыя нашай установы — гэта мастацтва і адукацыя, — гаворыць дырэктар школы мастацтваў Генадзь Жалязняк. — Школа развіваецца, яе вучнямі з'яўляюцца больш за 700 дзяцей, адкрываюцца новыя аддзяленні, нядаўна з'явіліся напрамкі эстраднага вакалу, харэаграфічны. Таму чакаем, што дагавор аб супрацоўніцтве дазволіць атрымаць новыя магчымасці не толькі ў плане павышэння кваліфікацыі нашых педагогаў, але і атрымання новых ідэй, новых метадаў работы.

Пасля падпісання дагавора пачнецца работа па напаўненні яго канкрэтнымі мерапрыемствамі, сярод якіх — удзел у семінарах і навукова-практычных мерапрыемствах, круглых сталах, абмен вопытам па ўкараненні і развіцці перадавых метадаў работы. Але аб адным мерапрыемстве гаворка ўжо адбылася: у планах школы — пастаноўка маладзёжнага фантастычнага мюзікла. Адной з першых пляцовак, дзе адбудзецца яго паказ, стане Інстытут развіцця адукацыі.

— Гледачамі яго будуць не толькі супрацоўнікі інстытута, — уступае ў размову рэктар ГрІРА Святлана Сяргейка. — Для нашых слухачоў такое супрацоўніцтва стане дадатковым бонусам, бо яны атрымаюць магчымасць акунуцца ў свет мастацтва, бо адукацыя і культура маюць агульныя мэты ў выхаванні чалавека.

У гэтым годзе Інстытут развіцця адукацыі заключыў ужо трэці дагавор аб супрацоўніцтве і сеткавым узаемадзеянні — з Тульскім дзяржаўным педагагічным інстытутам імя Л.М.Талстога і Інстытутам развіцця адукацыі Краснадарскага краю.

Афіцыйнае мерапрыемства пачалося і завяршылася на неафіцыйнай ноце — музычным вітанні выкладчыкаў школы мастацтваў. У сваю чаргу інстытут запрасіў прадстаўнікоў школы на майстар-клас у цэнтр пясочнай тэрапіі, які дзейнічае ў ІРА.

**Фота аўтара.**